


## У НУМАРЫ


| ***Навіны*** | ***Навуковая праца*** |
|---|---|
| **Кніга водгукаў** | **Заслаўе ў беларускай культуры** |
| **Выстава фотаработ Сяргея Плыткевіча** | **Батлейка – наша давняя традиция** |
| **Успаміны і персаналіі** | **Старонкі старых газет або згадкі аб Заслаўі** |
| **У музеі-запаведніку тэлеканал “РТР-Беларусь”** | |


## ***Навіны***

### Кніга водгукаў

**2015**

“Большое спасибо Лебёдкину Алексею Александровичу за интересную и познавательную экскурсию, за приветливую встречу и гостеприимство” (Барналава С.В., Емяльянава Е.А., г. Каломна, Маскоўская вобл., Расійская Федэрацыя, 24 сакавіка).

“Огромное спасибо за познавательную экскурсию Тамаре Андреевне [Гудына] — экскурсоводу и смотрителю музея Анне Николаевне [Харашэвіч]. С благодарностью, посетители из Вилейки” (3 мая).

“Выражаем огромную благодарность сотрудникам музейно-выставочного комплекса и блестящему экскурсоводу Дакуко Людмиле Романовне за интереснейшую информацию, душевность, волшебную атмосферу, созданную ею, в которую мы окунулись, насытились познаниями, позитивом и приятными впечатлениями. Спасибо за внимание, тепло и гостеприимство” (арганізатар экскурсіі настаўніца геаграфіі ДУА “САШ №188 для дзяцей з парушэннямі зроку г. Мінска” Э.І. Кавалько, 2 чэрвеня).

“Огромное спасибо за прекрасные выставки в вашем замечательном музее. Отдельную благодарность выражаем хранителям музея, Антонине Ивановне [Арцем’ева] и Валентине Павловне [Бакуновіч]. Желаем вам благополучия и процветания” (госці з Масквы, Расійская Федэрацыя, 9 чэрвеня).



*Кніга водгукаў музея-запаведніка,*
*якая захоўваецца ў музейна-выставачным комплексе*

“Коллектив преподавателей и сотрудников Института современных знаний имени А.М. Широкова выражает благодарность Шляхтицевой Маргарите за профессионально проведённую экскурсию. Очень важно в наше время сохранять крупицы своей самобытности и умение донести свои знания до экскурсантов. Так держать!” (І.П. Сергачова, 13 чэрвеня).

“Большое спасибо Маргарите Шляхтицевой за интересную экскурсию по музею” (госці з г. Мінска, 24 чэрвеня).

## Выстава фотаработ Сяргея Плыткевіча

Мастак, які працуе з фотакамерай, – гэта часта не меншы мастак, чым мастак, які працуе з пэндзлямі і фарбамі. Фотамастак – майстра, што знаходзіцца ў бесперапынным пошуку, шукае непаўторныя вобразы і формы сваім аб'ектывам, ловіць святло, сядзіць у “засадзе” гадзінамі, каб

зрабіць непаўторныя кадры з насельнікамі жывой прыроды – звярамі і птушкамі, і, калі яны атрымліваюцца, то стаюць сапраўднымі шэдэўрамі, здатнымі здзіўляць і прыцягваць увагу шырокай аўдыторыі. Сярод фотамастакоў, як і сярод мастакоў, што працуюць за эцюднікамі, маюцца свае класікі, так бы мовіць, майстры, выбітныя творцы, пра якіх ведаюць вельмі многія людзі, шануюць іх талент, здольнасці і адметныя вынікі адлюстравання іх генія ў аўтарскіх работах. Да такіх майстроў-класікаў, без перабольшванняў і дакладна, можна аднесці творцу Сяргея Плыткевіча, які сваімі фотаработамі здзіўляў не толькі Беларусь, але і ўвесь свет.



*Фотавыстава "Нечаканая Беларусь" (фотаработы Сяргея Плыткевіча)*

У музейна-выставачным комплексе нашага музея-запаведніка дзейнічае аўтарская выстава фотамайстры Сяргея Плыткевіча пад назвай "Нечаканая Беларусь". Наведваць яе можна будзе з 18 сакавіка да 12 красавіка, з 9.00 да 17.30, усе дні, апрача панядзелка. Таксама нагадваем аб тым, што першы аўторак месяца з'яўляецца бясплатным для наведвання аб'ектаў музея-запаведніка: Вы можаце завітаць менавіта ў такі дзень, пабачыць новую выставу і заашчадзіць грошы.

Не прамініце пабачыць нашу Беларусь дзівоснай і прывабнай, такою, якою яна ёсць. Дзякуючы прафесійнаму бачанню фотамастака, мы бачым тое, што было нашаму воку недаступна, схавана ад яго. "Нечаканая

Беларусь" адкрывае роднае па-новаму, незвычайным чынам. Сярод фотаработ прадстаўлены як прыродныя краявіды, так і створаныя чалавекам ландшафты. Запрашаем рабіць адкрыцці разам з Сяргеем Плыткевічам і гісторыка-культурным музеем-запаведнікам "Заслаўе"!

## Успаміны і персаналіі

*Працягваем друк успамінаў Аляксандра Калбаскі (пачатак у №9). Дадаткова адзначаем, што матэрыял, адлюстраваны ва ўспамінах, цэласна сфармаваўся ў 1999-2000 гг., таму не ўсе закранутыя ў ім аспекты могуць цалкам адпавядаць сённяшняму бачанню спецыялістаў музейнай справы. Матэрыял друкуецца фактычна без зменаў (або з мінімальнымі), апрача, галоўным чынам, захадаў скарачэння аб'ёму [Рэд.].*

***<u>Як пачыналася</u>***

### МУЗЕЙНЫ НАВІГАТАР, ЦІ ПАРАДЫ МУЗЕЙНАГА ДЫРЭКТАРА

**АЦЭНКА**

Чаму тут можна павучыцца?

Якія ў супрацоўнікаў дасягненні?

Якія недахопы ці правалы?

**Ці існуе стандартная схема аналізу і ацэнкі музейнай экспазіцыі?**

Так, існуе. Пад час стажыроўкі ў Міжнароднай Летняй Школе Музеялогіі ў Брно (Чэхія) нам была прапанавана схема аналізу і ацэнкі музейных экспазіцый, якая, на нашу думку, з'яўляецца дастаткова ўніверсальнай.

**Аналіз музейнай экспазіцыі**

Назва музея

Назва экспазіцыі

Шкала рэйтынгу:

0 – нездавальняюча

1 – ледзве здавальняюча

2 – часткова здавальняюча

3 – здавальняюча

4 – добра

5 – вельмі добра

6 – выдатна

Балы:

1. Характарыстыка музейнага будынка:

1.1. размяшчэнне

1.2. знешняя архітэктура

1.3. унутраная архітэктура

Усяго




*Аляксандр Калбаска.*
*Прэзентацыя кнігі “Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Заслаўя”, 2000 г.*

2. Зкспазіцыя з пункту гледжання:

2.1. размяшчэння ў будынку

2.2. даступнасці для наведвальніка

2.3. сістэмы арыентацыі наведвальніка

Усяго

3. Тэма экспазіцыі:

3.1. актуальнасць

3.2. адэкватнасць музейнаму профілю

3.3. выразнасць калекцый

Усяго

4. Падзел экспазіцыі на сегменты:

4.1. уваход

4.2. унутраная структура

4.3. заключэнне

4.4. экскурсійны маршрут

Усяго

5. Характар экспазіцыі з пункту гледжання:

5.1. архітэктурнага майстэрства

5.2. музейнай спецыфікі

5.3. тэхналагічнасці

5.4. захаванасці

5.5. анатаванасці

5.6. культурнай карыснасці

Усяго

6. Спосабы выражэння з пункту гледжання:

6.1. выбару прадметаў

6.2. упарадкаванасці прадметаў

6.3. архітэктуры

6.4. мастацкіх сродкаў

6.5. аўдыявізуальных сродкаў

6.6. асвятлення

6.7. дынамічнасці кампазіцыі

Усяго:

7. Інфармацыйныя сродкі з пункту гледжання:

7.1. тэкстаў

7.2. жывога каментару

7.3. гуку

7.4. друкаваных матэрыялаў

7.5. выкарыстання камп'ютара

Усяго

8. Публічнасць экспазіцыі з пункту гледжання:

8.1. рэкламы

8.2. інфармацыі

8.3. радыё, газет, тэлебачання

Усяго

9. Цікаўнасць публікі з пункту гледжання:

9.1. колькасць наведвальнікаў (у дзень)

9.2. з іх дзеці

9.3. дарослыя

9.4. наевдвальнікі з-за мяжы

9.5. ацэнка наведвальнікаў (кніга водгукаў, анкеты-апытальнікі, вывучэнне попыту)

Усяго

10. Агульнае уражанне --\\--

Для таго, каб атрымаць умоўна-лічбавы паказчык ацэнкі музейнай экспазіцыі, неабходна суміраваць набраныя балы па дзесяці ацэначных блоках:

Усяго № 1 + Усяго № 2 + Усяго № 3 + Усяго № 4 + Усяго № 5 + Усяго № 6 + Усяго № 7 + Усяго № 8 + Усяго № 9 + Усяго № 10 = ???

Экспазіцыя дзе УСЁ ВЫДАТНА рызыкуе набраць 240 балаў.

Дзе УСЁ ЧАСТКОВА ЗДАВАЛЬНЯЮЧА – 80 балаў.

Відавочна, што ацэнка вашай экспазіцыі трапіць недзе пасярэдзіне. Цікава, толькі, да якога боку бліжэй?

*Аляксандр Калбаска, прафесар ЕГУ,*
*дырэктар Запаведніка ў 1988-1994 і 1997-2000 гадах,*
*aliaksandr.kalbaska@ehu.lt*

**У музеі-запаведніку тэлеканал “РТР-Беларусь”**

22 сакавіка музей-запаведнік наведала здымачная група тэлеканала "РТР-Беларусь". Група здымала матэрыял па праекце (серыі перадач) "Мядовы месяц" на этнаграфічным комплексе музея-запаведніка, у суправаджэнні і з удзелам нашай навуковай супрацоўніцы Алены Вячаславаўны Пакінка.



*Здымачны працэс вядзецца на ганку музеефікаванага аб'екта "Млын".*
*У нацыянальным касцюме – супрацоўніца музея-запаведніка А.В. Пакінка*

Рэжысёр праекта – Надзея Колесава, вядоўцы: Дзіяна Кот і Сяргей Кульгаўчук, прадзюсар – Ганна Бурдынава. Знятая на нашых музеефікаваных аб'ектах перадача мае выйсці ў эфір тэлеканала "РТР-Беларусь" у адну з субот красавіка.

Дапамогу ў падрыхтоўцы інфармацыі аб здымачным працэсе аказала наша супрацоўніца – Людміла Раманаўна Дакука, фота таксама належыць яе аўтарству.

***<u>Навуковая праца</u>***

**Заслаўе ў беларускай культуры**

Неад'емнай часткай беларускай культуры з'яўляецца мастацтва ў самых розных сваіх праявах, стылях і накірунках. Мастакі, "узброеныя" тушшу, алоўкамі, алейнымі, акрылавымі, акварэльнымі фарбамі ствараюць сапраўдныя цуды, адкрываюць для нас свет прыроды і архітэктуры арыгінальным, непаўторным чынам. У іх працах можна пабачыць даўнія вякі, сучаснасць, мінуўшчыну, паяднаную ў адзінстве пераемнасці з нашым часам, іншыя ўвасабленні бачання творцаў.

Многія мясцінкі Беларусі, дзякуючы мастакам, якія натхніліся іх прыгажосцю і гісторыяй, атрымалі свой каларыт у свеце мастацтва, свае пазнавальныя і прывабныя воку гледачоў рысы. Такі каларыт, прытым не абы-які, а ўзнёслы і разнастайны займела, цягам многіх гадоў, і Заслаўе. Гэты старажытны горад з'яўляўся ў творах мастакоў, як у працах пачаткоўцаў, так і ў работах сталых творцаў, настолькі часта, што нельга сказаць, што гэта адбылося выпадкова. Адбылося гэта і працягвае адбывацца як эмацыйнае, духоўнае прызнанне за Заслаўем ролі незвычайнага цэнтра беларускай культуры, цэнтра з натхненнем і своеасаблівай аўрай даўніны.

Гэтым разам, да акрэсленай тэматыкі будзем звяртацца і ў наступным, разгледзім работу вядомага беларускага мастака Барыса Аракчэева "Заслаўе 9 мая". Згаданы твор захапляе сваімі "цёплымі" фарбамі, лагоднай атмасферай прыемнасці пагоднага майскага дня, такога светлага і радаснага, што лёгкасцю ды ўзнёсласцю поўніцца душа. Тут сучаснасць паядналася са старажытнасцю: на пярэднім плане бачым Спаса-Праабражэнскі Сабор (былы кальвінскі збор), які ўзвышаецца над усім краявідам, ды настолькі лёгка, што ніколькі не "ціснe" сваёй "вагой" стагоддзяў на астатні краявід, а спалучаецца з ім, як натуральная яго частка, далей бачым спартыўную пляцоўку сярэдняй школы №1, саму школу, частку сучаснай забудовы вуліц Заслаўя, а крыху ў далечы бачым як бруіцца вада Вілейска-Мінскай воднай сістэмы (Заслаўскага водасховішча або Мінскага мора), а па хвалях яго ходзяць пад белымі ветразямі чоўнікі, падобна, што гэта лёгкія яхты. Захапляе багатая колерамі палітра расліннасці, веснавой яскравай і сакавітай, гэта, нібыта, сама палітра жыцця.

Праца мае памеры 35х50 см, выканана алейнымі фарбамі на кардоне ў 1975 г. Пры сваім параўнальна невялікім памеры яна здолела ахапіць шырокі і разнастайны краявід, блізкія і крыху аддаленыя Заслаўскія абрысы.

Мінскае мора ўдалечыні выглядае, як мара, дадае краявіду казачнасці, робіць яго насычаным і завершаным. Станоўчае ўражанне ад спасціжэння дадзенага твора застаецца ва ўяўленні надоўга, што сведчыць аб дасягненні аўтарам выдатнага выніку візуалізацыі экспрэсіі.



*Барыс Аракчэеў "Заслаўе 9 мая", кардон, алей, 1975 г.*

Мы і надалей працягнем знаёмства з адлюстраваннем Заслаўскай тэматыкі ў творах беларускіх мастакоў. Пры гэтым, адзначым, што агульная колькасць гэтых прац з кожным годам павялічваецца, бо мастакі працягваюць маляваць Заслаўе. Значна гэтаму спрыяе і традыцыйны (штогадовы з 2018 г.) Міжнародны пленэр мастакоў "Заслаўскі Спас". Творчых людзей не падманеш, бо яны жывуць адчуваннем, душой, аддаюць перавагу арыгінальнаму і сапраўднаму. Менавіта таму яны і звяртаюцца да Заслаўя, душой і пэндзлем.

**Батлейка – наша давняя традиция**

Батлейка – народный кукольный театр, возникший в XVI веке в Европе и получивший широкое распространение на белорусских землях.

Батлейщики выступали на площадях и в заезжих домах, в шинках и просто в крестьянских хатах по всей Беларуси. Ещё в начале XX века батлейка была популярна, а к середине столетия практически исчезла.

ИКМЗ "Заславль" был в числе первых, кто стал возрождать этот вид народного творчества. Такая мысль возникла после очередной экспедиции по сбору музейных предметов. Из бесед с жителями Молодечненского района сотрудники заповедника узнали, что в одной из деревень жил батлейщик. В его заброшенном доме, на чердаке были найдены остатки ящика батлейки. Отреставрировать его не представлялось возможным, и появилась идея реконструировать народный кукольный театр в музее-заповеднике. Первыми сотрудниками заповедника, кто занимался воссозданием батлейки, были Анатолий Рисовец и Елена Шмагонец. Анатолий вырезал кукол, девушки – научные сотрудники отдела музейной педагогики – шили для них одежду. Каких-то персонажей заказали в Молодечно, в Минском областном театре кукол. Елена адаптировала сценарий спектакля "Царь Ирод": в литературных источниках нашлось несколько вариантов этой народной батлеечной пьесы. В 1990-х годах в заповеднике стали проводиться батлеечные спектакли в народной манере, когда один человек является кукловодом и одновременно озвучивает всех персонажей. Впоследствии батлейкой занимались Евгения Гринь, Констанция Леоновна Шахович. Сейчас батлеечные спектакли с успехом ведёт Татьяна Владимировна Орлова.



*Батлейка музея-запаведніка, убраная па-святочнаму*

Батлейка представляет собой деревянный ящик (шкафчик) с открывающимися со стороны зрителя дверцами, а сам батлейщик стоит сзади, за ней. В Беларуси существовало не менее пяти типов батлейки: одноярусный, двухъярусный, трёхъярусный, теневой и марионеточный. Оформлению всегда придавалось огромное значение – ведь поначалу батлейка демонстрировалась только в Рождественские праздники.

Название "Батлейка" происходит от слова "Бетлеем" – одной из форм названия города Вифлеем, в котором, согласно библейскому сказанию, родился Иисус Христос. Вначале она носила религиозный характер: разыгрывалась только одна пьеса "Царь Ирод", созданная по библейской легенде. Злой царь Ирод узнаёт, что с рождением Христа потеряет свою царскую власть, и поэтому приказывает убить всех новорождённых мальчиков.

Со временем к религиозному сюжету добавились бытовые, и батлейки стали делать с дополнительными ярусами. На верхних были персонажи, жившие в раю – Святое семейство, ангелы, пастухи, волхвы, на нижних – все остальные.



*Лялькі з батлейкі музея-запаведніка*

Батлейка в музее-заповеднике – двухъярусная. По традиции начинается представление с канонической постановки "Царь Ирод". За

почти 30 лет существования батлейки в музее неоднократно менялись куклы – их делали и народные мастера, и профессиональные мастера-кукольники. Как выяснилось, людей, заинтересованных в возрождении и сохранении народных батлеечных традиций, в Беларуси очень много.

*Инесса Соболевская,*
*заместитель директора по научной работе*

**Старонкі старых газет або згадкі аб Заслаўі**

На цікавую і арыгінальную інфармацыю, у тым ліку – на гістарычную, можна натрапіць цалкам выпадкова, калі гартаеш сваю стужку навін у сацыяльных сетках. У выпадку гістарычнай інфармацыі асабліва карыснай з'яўляецца сацыяльная сетка "facebook", у якой маюць акаўнты прафесійныя навукоўцы, робяць допісы (пасты), адпаведна тэматыцы сваіх навуковых пошукаў і цікаўнасцяў. Апрача таго, ёсць у facebook і адмысловыя асяродкі – суполкі (групы) гістарычнай скіраванасці, якія збіраюць і публікуюць адпаведны кантэнт. Да такога кшталту асяродкаў адносіцца і суполка "Культурная спадчына Габрыелі Пузыны ў Беларусі". Габрыеля Пузына – творчая асоба, якая родам паходзіла з Вільні, была паэткай і пісьменніцай, у ліку знаёмых мела такога вядомага творцу XIX ст. як Уладзіслаў Сыракомля. У шэрагу разнастайных матэрыялаў па гісторыі Беларусі ў стужцы суполкі, прысвечанай спадчыне Габрыелі Пузыны, сустракаюцца і арыгінальныя матэрыялы па гісторыі Заслаўя, напрыклад, – польскамоўныя артыкулы з перыядычных выданняў к. XIX-п. XX стст. Першым з іх ліку прапануем Вашай увазе артыкул за 1896 г., які падаецца ніжэй у перакладзе на беларускую.

**НОВАЯ ФАБРЫКА**

**Пішуць нам з Віленскай губерні:**

"У Заслаўі, непадалёк ад Радашковіч, некаторае бельгійскае таварыства (кампанія) хоча адчыніць фабрыку пражэння і ткацтва бавоўны. Прадстаўнік таварыства пачаў складаць дамоўленасць з панам Хамянтоўскім, цяперашнім уласнікам Заслаўя (некалі ён быў уласнасцю Прушынскіх), аб пакупцы пляца пад будаўніцтва фабрыкі. Для прадпрымальнікаў гэтае месца вельмі зручнае, бо Заслаўе ляжыць пры самой Лібава-Роменскай чыгунцы. Калі той праект будзе рэалізаваны,

мясцовасць гэтая вельмі ажывіцца, а Заслаўе павялічыць колькасць свайго насельніцтва і пабольшае тэрытарыяльна"*.



+ Nowa fabryka.

Piszą do nas z gub. wileńskiej:

„W Zaslawiu, niedaleko m. Radoszkowic, pewna spółka belgijska pragnie otworzyć przędzalnię i tkalnię bawełny.

Przedstawiciel spółki rozpoczął pertraktacje z p. Chomentowskim, obecnym właścicielem Zasławia (niegdyś był on własnością Prószyńskich), o kupno gruntu pod budowę fabryki.

Dla przedsiębiorców punkt ten jest bardzo dogodny, gdyż Zasław leży przy samej kolei libawsko-romeńskiej.

Jeżeli projekt ten przyjdzie do skutku, zakątek ten ożywi się bardzo, a Zasław zaludni się i wzrośnie.”

*Артыкул з газеты "Кур'ер Варшаўскі" (Варшава, 31 снежня 1896 г.) аб планах будаўніцтва новай фабрыкі ў Заслаўі*

Ці была гэта ідэя з фабрыкай ажыццёўлена, ці не – застаецца пытаннем. Як слушна сцвярджае галоўны захавальнік фондаў нашага музея-запаведніка Аляксандр Рак, для дакладнага вырашэння гэтага пытання трэба правесці архіўны пошук. Цікавае – побач, спадзяемся, што ўдасца высветліць інфармацыю па планаванай бельгійскім капіталам фабрыцы пражэння і ткацтва бавоўны ў Заслаўі, а таксама з часам адкрыць і іншыя невядомыя дагэтуль грані гісторыі горада Ізяслава і Рагнеды.

*** "Кур'ер Варшаўскі", Варшава, 31 снежня 1896 г. (Kurjer Warszawski, Warszawa, 31 grudnia 1896 г.)**

**Выданне не з'яўляецца камерцыйным:** распаўсюджваецца дармова (бясплатна) і выключна ў адукацыйных і асветніцкіх мэтах для знаёмства з працай і здабыткамі ДУ «ГКМЗ «Заслаўе».

**Газета «Заслаўскія Зборы» існуе толькі ў электронным выглядзе**, з мэтай рэалізацыі шырокага доступу да яе матэрыялаў праз сетку «Інтэрнэт», а таксама – ашчаднага стаўлення да прыродных рэсурсаў.

**Рэдкалегія: Сабалеўская І.В., Арцемьева І.Д., Пакінка А.В., Кандратовіч І.Г.**

**Рэгулярнасць:** газета выдаецца раз на месяц.